жавай. Д о м № 17 (2-я пал. 19 ст.) — 2-павярховы, Г-падобны ў плане, з вальмавым дахам. Сцены гал. і тарцовага фасадаў падзелены паяском на 2 ярусы. Вокны прамавугольныя з простымі ліштвамі. На 2-м паверсе невял. балконы з ажурнымі метал. агароджамі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Ампір*. *А. Ю. Пятросава.*

**ГРОДЗЕНСКІЯ КАРАЛЕЎСКІЯ МАНУФАКТУРЫ,** прамысловыя прадпрыемствы, засн. ў 2-й пал. 18 ст. ў Гродзенскай і Брэсцкай эканоміях па ініцыятыве гродзенскага старосты А. Тызенгаўза. Усяго было 21 прадпрыемства. У 1766 засн. «кампанія шарсцяных мануфактур», якая адкрыла 3 суконныя мануфактуры. Найб. з іх у Гародніцы мела 40 ткацкіх станкоў і інш. абсталяванне. Фарбавальнае аддзяленне вырасла ў самастойную мануфактуру. Гродна ў 2-й пал. 18 ст. стала важным цэнтрам маст. ткацтва на Беларусі (гл. *Гродзенскія дываны*). На шаўкаткацкай мануфактуры ў Гарадніцы (1770—1788) выраблялі маст. тканіны і паясы накшталт слуцкіх (гл. *Гродзенскія паясы*), на гродзенскай мануфактуры пацерак выраблялі таксама сталовы посуд (кварты, келіхі, бакалы, шкляніцы), аздоблены гравіроўкай медным колцам (гл. *Гродзенскае шкло*). На Г. к. м. працавала каля 1500 юнакоў і дзяўчат з сем'яў прыпісаных казённых сялян. Столькі ж было і надомных прадзільшчыц. Кіравалі мануфактурай кваліфікаваныя майстры, часцей наёмныя з Францыі, Бельгіі, Швейцарыі, Расіі і інш. (каля 70 чал.). Прадукцыя, асабліва прадметы раскошы, не мела збыту і залежвалася на складах. У выніку большасць прадпрыемстваў да канца 1780-х г. закрылася. Пасля ўз'яднання зах. ч. Беларусі з Расіяй дзейнасць некаторых мануфактур аднаўлена.

*Літ.:* Г и б я н с к и й Н. Г. Граф А. Тизенгауз и гродненские королевские мануфактуры.— П., 1916. *Я. Н. Мараш.*

**ГРОДЗЕНСКІЯ КНЯЖАЦКІЯ ПАЛАТЫ,** помнік архітэктуры 12 ст. Пабудаваны ў Гродне на тэр. *Гродзенскага Старога замка*. Рэшткі выяўлены ў 1932. Зберагласяпаўн. частка, якая ўключае 2 пабудовы: вялікую (даўж. 6,5 м) і малую (даўж. паўн. сцяны 0,83 м). Гэта быў 2-павярховы на каменным падмурку будынак з плінфы ў тэхніцы раўнаслойнай муроўкі. На кароткіх тарцах цаглін рэльефныя мулярскія знакі. Дэкар. муроўка звонку была аздоблена гарызантальнымі радамі амаль неапрацаваных камянёў.

Унутры сцены былі аформлены арачнымі нішамі, падлогі аздаблялі разнастайныя па форме і колеру паліваныя керамічныя пліткі. Быў накрыты свінцовымі лістамі. У 14—15 ст. да гал. ўвахода прыбудаваны новы ганак, будынак прыстасаваны да абароны.

*Літ.:* В о р о н и н Н. Н. Древнее Гродно.— М., 1954.— (Материалы и исследования по археологии СССР: № 41). *А. А. Трусаў.*

**ГРОДЗЕНСКІЯ КОРЧМЫ.** Пабудаваны ў 1770-я г. абапал гал. магістралі *Гарадніцы* (арх. Ю. Мёзер). Карчма «Галеча» складалася з кампактнага 2-павярховага мураванага будынка гасцініцы і выцягнутай, прамавугольнай у плане драўлянай стайні з цаглянымкаркасам, якая прылягала да дваровага



Гродзенскія корчмы «Галеча» (злева) і «Раскоша». Фасады (чарцяжы) і планы.

фасада гасцініцы. Будынкі былі накрыты высокімі 2-схільнымі дахамі. Уваход у гасцініцу вылучаўся цэнтр. рызалітам з фігурным франтонам. Карчма «Раскоша» мела сіметрычную кампазіцыю, складалася з трох 1-павярховых квадратных у плане аб'ёмаў, якія прылягалі адзін да аднаго вугламі і ўтваралі паўадкрыты двор. У цэнтр. аб'ёме размяшчалася гасцініца, у бакавых — стайні. Фасад гасцініцы быў аздоблены плоскімі лапаткамі і завяршаўся лучковым атыкавым франтонам, які закрываў тарэц 2-схільнага даху з мансардай. Стайні былі накрыты пакатымі 4-схільнымі дахамі, сцены аздоблены руставанымі лапаткамі. Не збераглісяя. *Т. В. Габрусь.*

**ГРОДЗЕНСКІЯ ПАЯСЫ,** вырабы Гродзенскай шаўкаткацкай мануфактуры А. Тызенгаўза (1770—88). Запрошаныя сюды франц. майстры ўзялі за аснову арнаментальную структуру, памер і кампазіцыйны падзел *слуцкіх паясоў*, але арнамент сярэдняй часткі і матывы на канцах пояса распрацавалі паводле франц. узораў, якія пазней былі заменены на ўсходнія.



Гродзенскі пояс. Фрагмент. Музей старажытнабеларускай культуры ІМЭФ АН БССР.

Росквіт персіярні (1774—78) звязаны з творчасцю ліёнскага майстра Ф. Селімана. Яго паясы вызначаліся гарманічнай кампазіцыяй, лёгкім рысункам, вытанчанасцю каларыту. У 1783 выраб паясоў спыніўся. Калекцыя Г. п. зберагаецца ў Дзярж. гіст. музеі ў Маскве. *Дз. С. Трызна.*

**ГРОДЗЕНСКІЯ РАТУШЫ,** назва 2 помнікаў грамадз. архітэктуры Гродна, якія існавалі ў канцы 15—1-й пал. 20 ст. Д р а ў л я н а я р а т у ш а пабудавана ў 1496 на гандл. плошчы. Мела рысы стылю рэнесансу. Была 2-павярховая, асіметрычнай кампазіцыі (у ніжнім паверсе крамы і склады, у верхнім — зала